МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ БІЯЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН І АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ПЕДАГАГІЧНЫХ ВНУ

Матэрыялы навукова практычнай канферэнцыі
26-28 кастрычніка 1994 г.

Мінск 1994

# ПРАДМОВА

Біялагічная адукацыя традыцыйна ляжыць у аснове падрыхтоўкі спецыялістаў любога профілю. Такім падыходам адрозніваюцца ўсе класічныя сусветныя сістэмы адукацыі, у тым ліку і сучасныя. Гэта зразумела, таму што кожны чалавек, незалежна ад яго прафесіі, павінен перш за ўсё ведаць свой арганізм і навакольнае асяроддзе, у якім ён жыве, разумець унікальнасць жыцця, яго каштоўнасць, рацыянальнасць і гармонію прыроды, развіваць пачуццё адказнасці за захаванне рэсурсаў і біялагічнай разнастайнасці біясферы. Без усеагульнай біялагічнай падрыхтоўкі насельніцтва нам не вырашыць экалагічных праблем, якія вельмі хутка нарастаюць у апошнія дзесяцігоддзі.

Шмат для каго біялагічныя веды абмежаваны школьным курсам, таму зразумела роля і адказнасць настаўніка за біялагічную падрыхтоўку вучняў. Гэту адказнасць падзяляюць педагагічныя ўстановы, якія выпускаюць настаўнікаў біялогіі.

Школьная і універсітэцкая адукацыя церпіць зараз перыяд ломкі, перабудовы, ідзе станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі, выхад на сусветныя стандарты. Гэта абумоўлівае распрацоўку новых навучальных дапаможнікаў. Стварэнне новай сістэмы адукацыі, у тым ліку і біялагічнай, пачынаецца не на голым месцы. У Беларусі працуюць творчыя педагагічныя кадры, вопыт якіх павінен улічвацца, мэтазгодна выкарыстоўваць шматгадовыя эфектыўныя вынікі супрацоўніцтва ВНУ з навуковымі ўстановамі, навуковы патэнцыял супрацоўнікаў і студэнтаў вышэйшых педагагічных устаноў.

Разнастайнасць напрамкаў і перспектывы развіцця біялагічнай адукацыі на Беларусі адлюстраваны ў дадзеным зборніку, які ўяўляе сабой вынікі шматгадовых навуковых даследаванняў біёлагаў педагагічных ВНУ, абагульненне іх практычнага вопыту ў справе арганізацыі заняткаў і навукова-даследчай работы студэнтаў.

Спадзяёмся, што матэрыялы зборніка зацікавяць спецыялістаў і арганізатараў біялагічнай адукацыі.

Г. А. Баўтута, М. Дз. Лісаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ